

# Слова — дэлегатам:

***Вітас ВАЙВАДА, намеснік начальніка філіяла “Асіповіцкае ўпраўленне магістральных газаправодаў” ААТ “Газпрам трансгаз Беларусь”:***

— Як ідэалагічны работнік, заўсёды цікаўлюся ўсім, што адбываецца ў краіне і свеце. Уважліва пазнаёміўся з Пасланнем Прэзідэнта беларускаму народу, а зараз, як і ўсе, чакаю V Усебеларускі народны сход. Спадзяюся, што ён унясе свежы струмень у нашу рэчаіснасць.

Будуць падведзены вынікі работы за пяцігодку і намечаны планы на будучыню, а гэта заўсёды вельмі адказна. З вялікай увагай буду слухаць выступленне кіраўніка краіны: як ён ацэньвае сітуацыю ў Беларусі, што нас чакае наперадзе?

Усім вядома, што зараз няпростае эканамічнае становішча, а таму важна знайсці правільнае выйсце з крызіснай сітуацыі. Мяне, як і большасць задзейнічаных у прамысловасці інжынерна-тэхнічных работнікаў, хвалюе далейшы лёс нашых прадпрыемстваў. Хочацца, каб зноў набралі абароты такія гіганты індустрыі, як МАЗ, БелАЗ, МТЗ, і ў той жа час усёй душой перажываю за мясцовыя прадпрыемствы — наш шклозавод, АЗАА і іншыя дастойныя лепшай долі. Важна знайсці правільныя шляхі развіцця, стварыць такія ўмовы, каб яны змаглі канкурыраваць з еўрапейскімі прадпрыемствамі. Наша дзяржава — сацыяльна арыентаваная, у ёй многа робіцца для жыхароў, але хочацца яшчэ і таго, каб кожны грамадзянін быў гарантавана забяспечаны рабочым месцам.

Усебеларускі сход — гэта знакавае палітычнае мерапрыемства, якое знамянуе пачатак новага этапу ў жыцці грамадства. Чакаем, што пяцігодка прынясе дзяржаве толькі пазітыўныя падзеі. Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка сказаў, што бягучы год павінен стаць пераломным у пераадоленні негатыўных тэндэнцый у эканоміцы. Будзем спадзявацца і прыкладаць усе намаганні для далейшага росквіту свайго рэгіёна і краіны ў цэлым.

*Раённая газета “Асіповіцкі край”*